ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ '90

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
15
САКАВІКА
№ 8(1637)

ОРГАН ПАРТКОМА,
РЭКТАРАТА,
КАМСАМОЛЬСКАГА
І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ЗНАЙШЛІ І АБЯСШКОДЗІЛІ

«Учора ў Дзяржаўны рэестр унесена першае адкрыццё 1990 года. Яго аўтары — А. Палякоў, Д. Гаркуноў, Г. Шпянькоў, У. Мацюшэнка»,— паведамляла газета «Рабочая трибуна» сваім чытачам на наступны дзень (глядзіце нумар газеты за 9 лютага г. г.). У чым жа сутнасць адкрыцця? Мы папрасілі расказаць аб гэтым аднаго з аўтараў — кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта хімічнага факультэта Георгія Пятровіча ШПЯНЬКОВА.

— Уявіце сабе такую сітуацыю. Гаспадыня трэ на тарцы моркву. Але... морква застаецца цэлай, а металічная тарка сціраецца. «Не можа такога быць»,— запярэчыце вы. Не спяшайцеся спрачацца, бо аналагічную сітуацыю назіралі, напрыклад, спецыялісты сельскай гаспадаркі: мяккае збожжа сцірала жалезныя латкі камбайнаў. Вельмі здзіўлены былі і тэкстыльшчыкі, калі звычайная нітка прымушала зношвацца рубінавую шпору. Выказвалі недаўменне чыгуначнікі, канстатуючы разбурэнне стальных колаў, а на пластмасавых тармазных калодках — з'яўленне стальной плёнкі. Вучоныя фіксавалі ўсе такія вось цуды. Хоць, як кажуць, факт быў відавочным, розум адмаўляўся ўспрымаць яго: павінна ж быць ўсё наадварот.

Тады вырашылі правесці дасканалы фізіка-хімічны аналіз. У выніку — знайшлі віноўніка разбурэння. Ім аказаўся вадарод. Паўстала пытанне: адкуль ён узяўся?

Доследы паказалі, што ён выпрацоўваецца ў працэсе трэння паверхняў. Вільгаць, якая ёсць у змазцы ці трапляе звонку, раскладваецца. Што пры гэтым атрымліваецца, ведае кожны школьнік. Заўважым, што кісларод мае ўласцівасць выпароўвацца, а атамы вадароду трапляюць у структуры метала, спалучаюцца ў малекулы і назапашваюцца пад паверхняй. Нарэшце, ім становіцца цесна і яны літаральна распіраюць метал — як гавораць вучоныя, накачваюць яго. Вядома, што атамам вадароду больш даспадобы высокія тэмпературы, таму яны і канцэнтруюцца пад паверхняй той ці іншай дэталі. Пры перанасычэнні вадародам міжатамныя сувязі аслабляюцца, і метал цячэ, нібы вадкасць, а пры трэнні намазваецца на мяккую паверхню.

Як жа змагацца з гэтай з'явай? Ёсць некалькі метадаў. Адзін з іх — у дэталі дабаўляюць рэчывы, якія ўлаўліваюць вільгаць і гэтым папярэджваюць утварэнне вадароду. Можна таксама пакрываць дэталі плёнкай, якая не прапусціць вадарод. Такія метады барацьбы з вадародным зношваннем паспяхова выкарыстоўваюцца нашай прамысловасцю. Варта адзначыць, што яны далі магчымасць ужо сёння сэканоміць 17 млн. рублёў.

*Ва універсітэце ідзе вылучэнне кандыдатур на ўдзел у конкурсе на пасаду рэктара. З прозвішчамі і кароткімі біяграфічнымі данымі прэтэндэнтаў на вакантнае месца вы зможаце пазнаёміцца ў наступным нумары газеты.*

НЯЎЖО?

## Лёд зрушыўся

Цягнік спраектавалі, зрабілі макет. Выдатна атрымалася, нічога не скажаш: прыгожа, з размахам — усім падабаецца. Засталося толькі «ажывіць» яго, каб мог крануцца з месца. Вось тут і пачалося: то грошай няма, то абсталявання не хапае — шмат усялякіх «дробязей».

Будаўніцтва нашага універсітэта нечым нагадвае такі вось цягнік з дзевятнаццаці вагонаў (столькі аб'ектаў патрэбна ўзвесці). Доўга яно знаходзілася на «мёртвай» кропцы. Але прыйшоў энергічны, зацікаўлены чалавек — новы дырэктар будуемых аб'ектаў В. М. Сапёлкін, і лёд зрушыўся. Праўда, каб новы універсітэт дзейнічаў на поўную магутнасць, патрэбна яшчэ шмат часу. Але ёсць галоўнае — пачатак. У Шчамысліцы ўжо ідзе будаўніцтва інтэрната і біялагічнага корпуса, сёлета пачнуцца работы па ўзвядзенню галоўнага корпуса, НДІ ЯП, сталовай. Усяго аб'ём капітальных укладанняў павінен дасягнуць 4,5 млн. рублёў і прыкладна на 3 млн. рублёў патрэбна выканаць будаўніча-мантажных работ.

Калі Віктар Мацвеевіч думае пра гэтыя мільёны, яго заўсёды ахоплівае хваляванне. Справа ў тым, што нават пры самай старанн ай рабоце будаўнікам не пад сілу выканаць такі аб'ём. А калі ўлічыць, што людзей не хапае і будматэрыялы пастаянна ў дэфіцыце. Ды і рэканструкцыяй старых аб'ектаў патрэбна займацца, выпраўляць чужыя недаробкі. Здалі, напрыклад, спорткомплекс на Кастрычніцкай, а трыбуны і стадыён «забыліся» ўключыць у план будаўніцтва. Зараз выгляд тут, шчыра скажам, не вельмі прывабны. Вось і падлічыце, колькі сіл затрачваецца на выпраўленне чужых памылак ці проста нядбайнасці.

А час ідзе і патрэбна спяшацца. Год здачы новага універсітэцкага гарадка «пад ключ» — 1996 — не за гарамі.

ХТО МЫ? ЯКІЯ ВЫ?



Незапланаваная сустрэча



*Аказваецца, і іх хвалююць такія ж праблемы, як і нас. І яны вырашаюць тыя ж пытанні, што і мы. Яны таксама заклапочаны ахова й навакольнага асяроддзя.*

*Гэта пацвердзіла і сустрэча з групай заходнегерманскіх студэнтаў з Бонскага універсітэта, якія, знаходзячыся праездам у Мінску, наведалі БДУ імя У. І. Леніна. Гутарка са студэнтамі гістарычнага факультэта вызначыла шэраг агульных пытанняў і праблем, над якімі задумваецца сёння заходнегерманская і савецкая моладзь.*

*Катрын Фогель, старшыня універсітэцкай арганізацыі «Грынпіс», расказала аб тым, чым займаецца іх суполка і якія экалагічныя акцыі праводзяць яе члены. У ходзе гутаркі было прынята рашэнне аб супрацоўніцтве «Грынпіса» ў ФРГ і экалагічнай групы, што дзейнічае ў Мінску. У час абмену думкамі нарадзілася ідэя: у красавіку гэтага года правесці ў МДУ імя М. В. Ламаносава кангрэс маладых эколагаў, у якім абавязкова павінны прыняць удзел і прадстаўнікі з нашага універсітэта.*

*А. ГУСАК.*
*Фота АЎТАРА.*

ТЭРМІНОВА Ў НУМАР

## МАМА, ТАТА І Я

— спартыўная сям'я. Пакуль не кожны можа пахваліцца гэтым. Звычайна не хапае часу. Праца, бібліятэка, магазін, хатняя гаспадарка — калі ўжо там весці дзяцей у басейн ці на тэнісны корт. А калі іх двое і спартыўныя комплексы ў розных канцах горада? Тады наогул малышам і марыць аб занятках фізкультурай не варта, не кажучы ўжо пра дарослых.

Супрацоўнікі Мінскага маладзёжнага парунснага цэнтра пры Белдзяржуніверсітэце і ВА «Гарызонт» улічылі такую акалічнасць. 15 сакавіка ў 18.00 яны запрашаюць дарослых і дзяцей у п. 492 фізічнага корпуса на арганізацыйны сход. Хлопчыкі і дзяўчынкі 1977—1982 гадоў нараджэння змогуць наведваць дзіцячую секцыю парусн ага спорту, а студэнты і супрацоўнікі універсітэта — крэйсерскіх яхт і віндсерфінга.

Так што чакаем, мамы і таты. Прыходзьце самі, прыводзьце дзетак.

ПРАШУ СЛОВА

## Абмяркоўваем праект

*Зацікаўленая размова па праекту Платформы ЦК КПСС адбылася на партыйным сходзе філасофска-эканамічнага факультэта. Камуністы адзначалі, што ў праекце ЦК прадстаўлена рэальная праграма далейшага развіцця нашага грамадства па шляху яго дэмакратызацыі і гуманізацыі, у значнай меры адлюстраваны інтарэсы і мэты сацыяльных груп, слаёў і грамадскіх рухаў краіны.*

*Аднак, на думку сходу, КПСС павінна больш дакладна вызначыць сваё месца ў дынамічнай палітычнай сістэме савецкага грамадства, адносіны да іншых сацыяльных сіл, даць ацэнку сучаснай сітуацыі ў краіне. Варта было б указаць таксама тыя канкрэтныя шляхі і механізмы ідэалагічнай і практычнай дзейнасці партыі як важнага палітычнага фарміравання, якія дазволяць ёй канструктыўна вырашаць неардынарныя праблемы грамадства на этапе перабудовы, прагназіраваць перспектывы далейшага сацыяльнага развіцця, заахвочваючы для гэтай мэты ўсе перадавыя сілы краіны.*

*Адзначалася таксама, што ў праекце Платформы аддадзена даніна старым традыцыям і перш за ўсё — імкненню КПСС самой планаваць і вырашаць канкрэтныя эканамічныя задачы (і нават з указаннем даволі канкрэтных тэрмінаў). Камуністы ж факультэта бачаць шляхі развіцця партыі ў карэнных зменах яе статуса, у пераўтварэнні яе перш за ўсё ў ідэалагічную і палітычную сілу грамадства, здольную распрацаваць, галоўным чынам, стратэгію ўдасканалення сацыялізму, формы і метады работы з савецкімі людзьмі ў такі цяжкі і адказны час.*

*А. БАРКОЎСКАЯ,*
*сакратар партыйнай арганізацыі філасофска-эканамічнага факультэта.*

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Зінаіда АЛЯШКЕВІЧ.

## ВЫБАРЧЫ ЎЧАСТАК

# «Я — за палітыку разумнага сэнсу»



**Асістэнт кафедры кібернетыкі БДУ імя У. І. Леніна, проста малады чалавек і кандыдат у народныя дэпутаты Мінскага гарадскога Савета. Пра кожнага з іх можна расказваць асобна. Але паспрабуем адразу пра ўсіх такіх розных.**

Спачатку пра асістэнта кафедры кібернетыкі БДУ імя У. І. Леніна Вячаслава Міхайлавіча.

Выбар спецыяльнасці быў запраграміраваны ім у... сёмым класе, калі перамог у Івацэвіцкай раённай алімпіядзе па матэматыцы. Лагічным успрымаецца пасля гэтага паступленне ва універсітэт, дыплом з адзнакай, аспірантура і цяперашняе з'яўленне дамоў каля 10 гадзін вечара: вячэрнікі, лабараторныя заняткі. Студэнты? Ёсць разгільдзяі і самазабыўныя. Болей раскаваныя ў сваіх думках і выказваннях. Увогуле, прызнае Вячаслаў Міхайлавіч, могуць тое, чаго я ў іх узросце яшчэ не ведаў. Не так ужо і дрэнна, калі вучні маюць магчымасць перарастаць сваіх выкладчыкаў.

Сам Вячаслаў Міхайлавіч мае больш за 20 друкаваных работ, распрацаваў дзве методыкі, якія ўкаранёны. Займаецца ён пытаннямі забеспячэння надзейнасці тэхнічных сістэм. Звычайна субяседнікам гэта ні аб чым не гаворыць — у назве адсутнічае знешняя прывабнасць. Але пры сённяшнім дэфіцыце электронікі гэта не такая ўжо і дробязь — надзейна распрацаваная методыка адбракоўкі, калі магчымыя дэфекты можна вылоўліваць на этапе вытворчасці.

Кандыдатам навук, як двое з яго аднакурснікаў, Вячаслаў Міхайлавіч пакуль не стаў. Але добры спецыяліст і без тытулаў застанецца спецыялістам — «у кожнага свой лёс, а ў мяне не так многа часу, каб траціць яго на зайздрасць». І пасля гэтага нехта адважыцца папікаць яго прамаруджваннем?

А цяпер знаёмцеся са Славам. Яму трыццаць гадоў, жанаты на былой аднакурсніцы (цяпер інжынеру-тэхнолагу НВА «Гарызонт»). Захапляецца гісторыяй рускай філасофіі (гэта ад мамы — настаўніцы гісторыі), жывапісам (калі бывае ў камандзіроўках у Маскве, хутчэй наведае Пушкінскі музей, чым кінатэатр). Апошнім часам старанна вывучае азбуку: працаваць над літарамі ў адзіночку шасцігадовая дачка Волечка ўпарта адмаўляецца. З 1977 года жыве ў інтэрнаце. Тады ж адкрыў у сабе здольнасці займацца грамадскай дзейнасцю. Менавіта ў будатрадах (тры гады ў Пскоўскай вобласці, год у Карэліі, у Мінскай вобласці, камісарам Карэльскага занальнага штаба, камісарам інтэрнацыянальнага атрада універсітэта). Пасля ўсяго пералічанага па-ранейшаму выпадковым лічыць атрыманне медаля «За працоўную адзнаку».

Інтэрнат — не ад добрага жыцця. Летнія месяцы ў будатрадах — таксама. І дапамога бацькоў — ад аспіранцкіх 85 (у тыя часы) рублёў.

Але, што датычыць яго асабістага, хопіць. Лепш давайце пра алагічнасць сітуацыі, у якой апынуўся ў свой час і сам Слава. Дзяржава — асоба зацікаўленая ў наяўнасці сапраўдных спецыялістаў, стварае шэраг забарон для іх: прапіска, адсутнасць жыллёвых умоў, нізкія заробкі ў моладзі. Ніхто не падлічвае, ніхто не прадумвае наперад мэтазгоднасць нашых законаў. Скажам, аб ільготах маладым спецыялістам.

— А чалавек становіцца спецыялістам да 30 гадоў, далей стварацъ базіс позна,— сумна заканчваецца наша размова.

Потым была сустрэча з кандыдатам Малафеевым. Здаецца, няма чалавека, які б, пачуўшы прозвішча, не пацікавіўся: ці не сваяк? Многія выбаршчыкі, зазірнуўшы ў лістоўку, абураліся: «Усюды працягваюць «сваіх» людзей». А ён нічыім сваяком: ні Малафеева-трэнера, ні Малафеева-сакратара абкома не з'яўляецца. Нават прозвішчы ў рускім варыянце не супадаюць: у іх першае «а», у яго — «о». І ніякай карысці для сябе ад гэтага «сваяцтва» Малафееў не шукае. Толькі славалюбства калі-нікалі не дае спакою, бо гонар прозвішча паспелі стварыць іншыя.

**— Наколькі мне вядома, у час сходу па вылучэнню кандыдатаў, ты не меў асаблівага жадання станавіцца дэпутатам...**

— Наогул гэта атрымалася неяк выпадкова. Была нечаканай аднадушная падтрымка працоўнага калектыву факультэта. Дарэчы, такія адносіны да мяне — адна з самых станоўчых эмоцый апошняга часу.

**— Ты балаціруешся ў гарадскі Савет народных дэпутатаў. Як лічыш, ці хопіць у цябе кампетэнтнасці?**

— Зыходзячы з майго меркавання, што палітыка і заканадаўства выпрацоўваюцца ў Вярхоўным Савеце рэспублікі, туды павінны быць абраны эканамісты, юрысты, палітолагі. Функцыі гарадскога Савета — гэта ў асноўным выканаўчая работа. Яму на практыцы рэалізоўваць усе рашэнні, а значыць, не абысціся без прадстаўнікоў розных спецыяльнасцей. І такіх «тэхнароў», як я — таксама. Арыентуюся на два блокі праблем: маладзёжная палітыка плюс адукацыя і культура.

**— Ты член КПСС. Ці не перашкаджае табе гэта займацца сёння дзейнасцю, скіраванай на пераўтварэнне існуючых у нашай краіне адносін?**

— Я лічу, што камуністычная ідэя не загінула. Пацярпела крах толькі тая мадэль сацыялізму, што была прынята ў нашай краіне. Нельга нават сцвярджаць, што не апраўдаў сябе сацыялізм у цэлым, бо існуе і развіваецца, скажам, мадэль сацыялізму ў Швецыі.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза мае перспектывы, праўда, для гэтага яна павінна быць парламенцкага тыпу. І тое, што сёння аб'яўлена дэмакратычнай платформай КПСС — гэта крыніца, якая, магчыма, прынясе жыццё нашай партыі.

**— Які элемент сацыялізму табе менш за ўсё падабаецца?**

— Я не прымаю жорсткі цэнтралізм і манапалізацыю. Гэта прадвызначыла крах савецкай мадэлі сацыялізму.

Мы абвяшчалі сябе дыялектыкамі і матэрыялістамі, а на практыцы аказаліся дагматыкамі і метафізікамі.

Дэмакратызацыя палітыкі, ідэалогіі, культуры — адзін з галоўных тэзісаў маёй перадвыбарнай праграмы. Таму я «за» рэалізацыю ідэі многапартыйнасці. Неабходна стварыць магчымасці свабоднаму функцыяніраванню розных грамадскіх арганізацый. А ў межах ідэйнай барацьбы (успомнім закон адзінства і барацьбы процілегласцей) грамадства і будзе рухацца ўперад.

**— Калі здзейсніцца тваё праграмнае палажэнне аб многапартыйнасці, ці застанешся ты ў КПСС?**

— Цяжкае пытанне. Але якраз тут вельмі дарэчы ўспомніць афарызм Сенекі: «Бязглузда ствараць планы на ўсё жыццё, калі не з'яўляешся гаспадаром заўтрашняга дня». Сітуацыя ў краіне мяняецца па месяцах. Я салідарны з прынцыпамі дэмакратычнай платформы КПСС. Калі вылучыцца гэтае крыло ў асобную партыю, буду хутчэй за ўсё ў ёй.

**— Твае ўражанні ад мітынгу, што адбыўся 25 лютага ў Мінску?**

— Ён ускалыхнуў грамадскую думку напярэдадні выбараў, таму што ўся перадвыбарная кампанія праходзіла даволі вяла. І ўсё ж мітынг — не тое месца, дзе можна вырашыць праблемы. На ім можна толькі ставіць пытанні. Галасаванне за прыняцце рэзалюцыі, якая складалася асобнымі людзьмі, з'яўляецца фармальным. Што насцярожыла мяне і непрыемна ўразіла? Аднадушша, з якім прымаліся ўсе пункты небездакорнай рэзалюцыі. Мы ўзняліся на новы віток, з вышыні якога дазваляем сабе крытыкаваць застойныя часы, але па-ранейшаму баімся вылучыцца з натоўпу.

**— Ці былі абумоўлены твае сустрэчы з выбаршчыкамі жаданнем апярэдзіць сваіх супернікаў у дзень галасавання?**

— Адзін з маіх жыццёвых прынцыпаў: чыстую палітыку робяць чыстымі рукамі. Паколькі большасць выбаршчыкаў сёння жадаюць выбіраць свядома, сустрэчы былі неабходны як мне, каб ведаць праблемы акругі, так і ім, каб упэўніцца, наколькі я задавольваю іх патрабаванні.

У 1985 годзе Вячаслаў Міхайлавіч Малафееў скончыў аспірантуру, у лістападзе 1989 яму споўнілася 30 гадоў, у студзені 1990 калектывам факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна ён быў вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты Мінскага гарадскога Савета па Курчатаўскай выбарчай акрузе № 93.

Матэрыял падрыхтавалі:
І. ВЕРХАВОДКА,
З. МАРАВА.

## НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК



### Скааперуемся?

Калі вы пры машыне, ёсць боязь страціць яе. Цалкам ці часткова. Цьфу, цьфу, цьфу... І ўсё ж асцярожнага і злодзей абыдзе. Не палянуйцеся звярнуцца ў кааператыў «Нёман», дзе праводзяць замацаванне лабавога шкла на легкавых аўтамабілях усіх марак, якое гарантуе іх ахову пры зняцці з мэтай крадзяжу.

*Вас чакаюць пасля 17.00 кожны дзень па адрасу: вул. Славінскага, 12, гаражы Рэспубліканскага дома тэхнічнай творчасці.*

### Сябры... па перапісцы

Нас, як і кожнага савецкага чалавека, не могуць не хваляваць канфлікты на нацыянальных падставах, якія апошнім часам здараюцца ўсё часцей і часцей. Таму мы вырашылі стварыць банк адрасоў пры клубе перапіскі «Лада». Перапіска моладзі, на думку членаў клуба, будзе спрыяць збліжэнню народаў, што жывуць у нашай шматнацыянальнай краіне.

Калі вы хочаце мець сяброў па перапісцы, то напішыце нам. Клуб перапіскі «Лада» дапаможа вам знайсці аднадумцаў або таварышаў па інтарэсах.

Для гэтага дастаткова запоўніць анкету:

1. Імя, прозвішча (пол, дакладная дата нараджэння).
2. Поўны адрас.
3. Мовы, якімі валодаеш, вывучаеш.
4. Інтарэсы і захапленні.
5. Што ты яшчэ хацеў бы расказаць пра сябе?
6. З кім бы хацеў перапісвацца?
   а) у якой рэспубліцы, раёне?
   б) узрост
   в) пол.

**Накіруйце анкету на адрас: 445859, Тальяці, ГСП, бульвар Каралёва, 13. Тальяцінскі філіял Куйбышаўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, клуб перапіскі «Лада».**

У пісьмо не забудзьце пакласці канверт са зваротным адрасам.

## Sos! Sos! Sos!

# КАМП'ЮТЭРНЫ СНІД

*Пра камп'ютэрны «вірус» мы даведаліся каля пяці гадоў назад з паведамленняў у друку. Потым убачылі судовы працэс над студэнтам каледжа, што стварыў «вірус», які стаў прычынай «захворвання» многіх камп'ютэраў. Першапачаткова рэакцыя на гэта была такой, як на паведамленні аб СНІДзе: «Гэта ў іх, а нас не датычыць». На жаль, датычыць, а мы, як звычайна, да барацьбы з хваробай не гатовы.*

Зараз «вірус» распаўсюджваецца адначасова з праграмным забеспячэннем. Ён экспартуецца з Захаду разам з выстаўкамі камп'ютэраў, размнажаецца пры капіраванні праграм. З'явіліся і айчынныя «самадзелкі» — народ у нас таленавіты. Стварае «вірусы» ў асноўным моладзь — студэнты, школьнікі. Штурхае іх на гэта звычайна жаданне паспрабаваць свае сілы. Потым працэс выходзіць з-пад кантролю і ўжо пры ўсім жаданні яго нельга спыніць. Як ні дзіўна, але пакараць таго, хто заражае камп'ютэры, мы не можам — няма такіх артыкулаў у законе.

**Што ж з'яўляецца асноўнымі прычынамі заражэння праграмнага забеспячэння вірусамі?** У першую чаргу — нізкая культура тых, хто працуе на ЭВМ. Вядомы выпадкі стварэння «вірусаў» і «лагічных бомб» з мэтай шантажу для павышэння зарплаты, помсты пры звальненні праграміста. Такая «бомба» можа ўзарвацца ў вызначаны час, праз пэўную колькасць выкананняў праграмы або капіраванняў, пасля падачы сігналу цераз камп'ютэрную сетку. Пры «выбуху» знішчаецца вялікая колькасць інфармацыі, праграмнага забеспячэння, магчыма паступовая мадыфікацыя праграм.

Такім жа спосабам можа абараніць сябе распрацоўшчык праграм супраць свавольнага капіравання, таму што аўтарскіх правоў на праграмы ў нас практычна не існуе.

**Што ж такое «вірус»?** Гэта праграма, якая можа самастойна размнажацца, пераносіць сябе на дыскі, перадавацца па сетцы і парушаць работу камп'ютэраў. У памяць «персаналкі» «вірус» трапляе разам з праграмай, у якой знаходзіцца. Запуск праграмы ажыўляе яго. «Вірус» можа аказацца ўсюды: у аперацыйнай сістэме, у прыкладной ці сістэмнай праграме, у адной з бібліятэк.

Усе «вірусы» можна падзяліць на класы. Напрыклад, замаруджання работы камп'ютэра, перазагрузкі, падаючых літар і іншыя. Часам пры рабоце з камп'ютэрам можна ўбачыць, як па экрану бегае невялікая казяўка і «з'ядае» літары. Бываюць «вірусы», якія «працуюць» па пятніцах, і г. д.

**Як змагацца з «вірусамі»?** Ёсць некалькі дзесяткаў праграм-«антывірусаў», прызначаных для выяўлення «вірусаў» пэўных класаў па адпаведных камбінацыях каманд або для іх знішчэння (лячэння праграм). Пры выкарыстанні «антывірусаў» патрэбна быць пільным, таму што яны самі могуць быць «інфіцыраванымі». Найбольш надзейны спосаб барацьбы — кантроль за памерам праграмных файлаў. Яго змена азначае ні што іншае, як з'яўленне «віруса». Можна параўноўваць праграмы з дыстрыбутывам, у якім вы ўпэўнены. Магчымы кантроль перасылак. Праўда, гэтым павінны займацца «дактары». На маю думку, варта было б ва універсітэце стварыць нешта накшталт дыягнастычнага ці лячэбнага цэнтра. Гатовы абмеркаваць праблему (тэлефон кафедры 26-55-39).

**В. РАМАНЧЫК,**
**дацэнт кафедры лікавых метадаў і праграміравання механіка-матэматычнага факультэта.**

## Б'ЕМ ТРЫВОГУ!

# У ХОВАНКІ З АГНЁМ

Вось ужо некалькі гадоў адміністрацыя універсітэта апантана верыць у тое, што з гульні ў кошкі-мышкі з Дзяржпажнаглядам выйдзе пераможцай і не збіраецца выконваць супрацьпажарныя мерапрыемствы. Аб гэтым сведчаць вынікі пажарна-тэхнічнага абследавання інтэрнатаў №№ 2, 6 і 7 па вуліцы Кастрычніцкай. Дзверы, якія ўваходзяць у сістэму дымавывядзення, не абсталяваны прыборамі самазачынення. Студэнты па-ранейшаму карыстаюцца ў інтэрнацкіх пакоях бытавымі электранагравальнікамі.

І ўсё б нічога, калі б спаборніцтвы па барацьбе з прадпісаннямі Дзяржпажнагляду не ўцягвалі ў яшчэ больш небяспечную гульню з агнём сотні людзей. Выяўлена, напрыклад, што вахцёры і дзяжурныя студэнты вельмі цьмяна ўяўляюць сабе, што павінны прадпрымаць у выпадку пажару. А часам і самі адключаюць устаноўкі пажарнай сігналізацыі: звініць, маўляў, перашкаджае працаваць.

Агонь рэдка жартуе. Няўжо для таго, каб мы сабе гэта ўсвядомілі, патрэбна надзвычайнае здарэнне, пры якім хавацца прыйдзецца нам самім?

**А. ФІЛОН,**
**інжынер Дзяржпажнагляду СВПЧ-1 па ахове Ленінскага раёна.**

ДЗЕЛАВЫЯ ЛЮДЗІ




# УРАЎНЕННІ З УСІМІ ВЯДОМЫМІ

## «Свае» і «чужынцы»

«Крыжовы паход» супраць кааператываў, блаславёны восенню мінулага года на сесіі Вярхоўнага Савета СССР, працягваецца з «галавакружальным» поспехам. Ахвярамі «свяшчэннай вайны» сталі, аднак, не запланаваныя дзяльцы ценявой эканомікі, спекулянты і хапугі, а, у большасці сваёй, добрасумленныя і працавітыя людзі. Знясіленыя вялікім падаткам, сціснутыя пазыкамі і крэдытамі, многія «неільготныя» кааператывы вымушаны або спыніць сваё існаванне, або ўзвінціць цэны. Апошняе яшчэ больш падлівае масла ў полымя грамадскай непрыязні да «нэпманаў», дае чыноўнікам маральнае права ставіць палкі ў колы новага ўклада эканомікі. Інстынкт пошуку «ворагаў народа» зноў абудзіўся. Праўда, цяпер не тое, што пры «бацьку», усіх «адшчапенцаў» ні ў Курапаты, ні па этапу на перавыхаванне не адправіш. Але расквітацца з чужым сацыялізму элементам ёсць шмат спосабаў і ў наш час. Дарма, што той ці іншы кааператыў займаецца вытворчасцю карысных і вельмі неабходных краіне прылад. Ён не такі, як усе нашы рэнтабельныя і нерэнтабельныя, патрэбныя і непатрэбныя дзяржпрадпрыемствы. Ён — прывід капіталізму, што невядома як заблукаў на радзіму развітога сацыялізму. Ён палохае нашых чыноўнікаў, наменклатуршчыкаў і абывацеляў.

Кааператыў «БІМЕР», які два гады назад арганізавалі супрацоўнікі і студэнты двух факультэтаў-суседзяў (радыёфізікі і электронікі і біялагічнага) БДУ імя У. І. Леніна, ніколі не ставіў перад сабой мэты падарваць асновы сацыялізму. Хутчэй наадварот. Стваральнікі кааператыву мелі самыя дабрачынныя намеры, аб чым сведчыць нават назва: БІМЕР — абрэвіятура слоў «біялогія», «медыцына», «радыёэлектроніка». Менавіта на службу гэтых навук і накіравалі свае намаганні маладыя навукоўцы. Дакладней, яны пачалі выпускаць прылады і абсталяванне для «малога» практыкума. Фізіёлагі, нейрафізіёлагі, біёлагі савецкіх навукова-даследчых установ былі на сёмым небе, даведаўшыся, што, нарэшце, і ў нашай краіне з'явяцца сучасныя прылады, бо вытворчасць падобнага абсталявання дзяржаўныя прадпрыемствы спынілі яшчэ ў сямідзесятыя гады. І, безумоўна, старыя электралямпавыя апараты ўжо не адпавядаюць цяперашнім патрабаванням не толькі вучоных, але і студэнтаў-медыкаў і біёлагаў.

— Неяк мне даводзілася весці заняткі ў медыцынскім інстытуце,— гаворыць адзін з арганізатараў «БІМЕРа», кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік НДЛ біяэнергетыкі Леанід Мароз.— Мяне проста ўразіла, што будучыя медыкі праводзяць практычныя работы пры дапамозе прымітыўных прылад. А для таго, напрыклад, каб паказаць студэнтам, як функцыяніруе сэрца паддоследнай жабы, выкладчыкам даводзіцца выкарыстоўваць звычайную нітку з іголкай і драўляны рычажок. Вось і ўвесь механізм. Няцяжка ўявіць цяпер, чаму ў нас самыя некваліфікаваныя ўрачы. Як іх эканомна вучаць, так непрафесійна яны і лечаць.

Дарэчы, на недахоп сучаснага абсталявання можа паскардзіцца амаль кожная ВНУ, НДІ і, бясспрэчна, сярэдняя школа рэспублікі. Таму прастора для дзейнасці «БІМЕРа» адкрывалася бязмежная. Хутка пасыпаліся і заяўкі ад заказчыкаў. Вось тут і паказала свае зубы камандна-адміністрацыйная сістэма ў асобе кіраўнікоў прадпрыемстваў і ведамстваў, і наш ваяўнічы Закон аб кааперацыі, і шэраг невядомых падводных плыняў, надзеленых уладай і правам «Не пускаць!», «Не дазваляць!», «Не прадастаўляць!». І яшчэ ў тысячу выпадках «не!!!»

## Павер у «БІМЕР»!

«БІМЕР» — кааператыў адмысловы. Яго супрацоўнікі не толькі выдатныя практыкі, інжынеры і канструктары, але і апантаныя даследчыкі. Спрадвечная незайздросная доля савецкіх вучоных, якіх прывучылі да прынцыпу: «Любіш коўзацца — любі і саначкі цягаць з сабой», саслужыла на гэты раз добрую службу. Хлопцы з «БІМЕРа», напакутаваўшыся без сучаснага абсталявання ў сваіх НДЛ, выдатна разумеюць, якімі якасцямі павінна валодаць тая ці іншая прылада. І не дзіўна, што навукоўцы з Мінска, Кіева, Масквы і нават з-за мяжы не супраць доўгатэрміновых кантрактаў з кааператывам. Аднак «БІМЕР» пакуль што вымушаны адмаўляцца ад паставак сваёй прадукцыі.

— Увогуле, слова «серыйны» да нашай работы зусім не дапасуецца,— тлумачыць Леанід Мароз.— Мы часта выконваем аднаразовыя заказы і ставіць нашу вытворчасць на канвеер няма патрэбы. Прычына нашай невялікай эфектыўнасці ў адсутнасці ўзаемаразумення з кіраўнікамі прадпрыемстваў. Не хочуць з намі супрацоўнічаць, не згаджаюцца здаваць у арэнду (у нерабочы час) сваё абсталяванне, не дазваляюць сваім рабочым у няўрочны час працаваць на кааператыў. Недавер да кааператываў зараз агромністы. І ў выніку не толькі мы пакутуем ад гэтага. Самі прадпрыемствы нясуць страты.

Сапраўды, скажам, кааператыву вельмі часта патрэбны каркасы для навукова-даследчых прылад. У заводскіх умовах гэта зрабіць проста. Аднак ні адзін кіраўнік прадпрыемства не згаджаецца прымаць такі невялікі заказ. Зразумела, у цэлым гэта заводу не выгадна. «БІМЕР» мог бы даць магчымасць падзарабіць рабочым. Заплаціць прадпрыемству за арэнду і амартызацыю абсталявання. Ёсць жа ў нас прадпрыемствы, што функцыяніруюць не кругласутачна. Гэта якраз той выпадак, калі за прастой плацяць. Не вераць гаспадарнікі кааператывам, асцерагаюцца з імі кантачыць. Таму і даводзіцца «БІМЕРу» весці натуральную вытворчасць — усё рабіць у недрах свайго цеснага памяшкання. І часта атрымліваецца, што звычайны каркас для звышскладаных прылад займае больш часу, чым зборка самой прылады. Неаднойчы, даведзеныя да адчаю ад уласнай бездапаможнасці, парываліся кааператары закупіць свае станкі і абсталяванне. Але куды яго паставіць? Памяшкання ў «БІМЕРа» няма, а ў арэндуемай ва універсітэце лабараторыі і без таго цесна. Словам, кааператыў трапіў у цэйтнот. Выбрацца з яго без чыесьці дапамогі бадай што немагчыма. Застаецца спадзявацца на міласць добрага дырэктара завода ці чакаць, калі універсітэт адзначыць сваё наваселле. Можа там будзе менш праблем з памяшканнем. Між іншым, не нахлебнікам збіраецца жыць «БІМЕР» на шыі універсітэта. Неабходныя прылады і абсталяванне кааператыў ужо зараз прадае альма-матэр па невысокіх цэнах і ў дадатак бясплатна абслугоўвае і рамантуе іх. Ды і заказы першачаргова прымае ад універсітэта. Зрэшты, не адзін БДУ імя У. І. Леніна зацікаўлены ў існаванні «БІМЕРа».

## Капейка валюту беражэ

У мінулым годзе на міжнародным навуковым сімпозіуме ў Пушчына «бімераўцы» дэманстравалі свой апарат для рэгістрацыі іённых токаў. Прылада гэта настолькі ўразіла прысутных, што англічане адразу ж прапанавалі за яе 4 тысячы фунтаў стэрлінгаў. Нават карыфеі сусветнай электронікі — японцы і тыя выявілі жаданне сябраваць з «БІМЕРам».

Ёсць у кааператараў і гандлёвая дамоўленасць з балгарскімі НДІ. Ды і тут не абышлося без перашкод. На афармленне патэнтных дакументаў для продажу навукова-даследчай апаратуры затрачваецца не менш месяца. Таму пра шматлікія кантракты і гаворкі няма, у адных паперках давядзецца корпацца ўсім членам кааператыву ці наймаць цэлую армію справаводаў. З другога боку, не вельмі патрыятычна збываць дэфіцытныя прылады за мяжу, не задаволіўшы попыт унутры рэспублікі. Зрэшты, аб гэтым, як ні парадаксальна, пякуцца больш за іншых самі кааператары, абіваючы парогі паважаных устаноў, даказваючы там карысць і неабходнасць сваёй прадукцыі. Але міністэрствы і ведамствы ўпарта не паддаюцца на ўгаворы, лічаць больш надзейным супрацоўніцтва з замежнымі фірмамі. Венгерская фірма «Спірметрыя» збывае нам свае медыцынскія ўстаноўкі на 43 тысячы інвалютных рублёў за кожную. Аналагічныя кааператыўныя прылады каштуюць 3,5 тысячы, ды яшчэ і па якасных паказчыках намнога пераўзыходзяць. Дарэчы, венгры прапанавалі за ліцэнзію апарата «БІМЕРу» больш за 60 тысяч рублёў. Хлопцы не згадзіліся, добра разумеючы, што праз год гэтыя прылады «Спірметрыя» будзе прадаваць нашай краіне па максімальна высокай цане.

— Хто яго ведае, што лепш: з боем выпускаць іх ці аддаць на сумленне замежных фірм? Там умовы спрыяльныя і вытворчасць хутка наладзяць. Вось толькі цэны «саюзнікаў» кусаюцца. Нашы апараты намнога дзешавей, акрамя таго, мы прадаём за неканверсуемыя рублі. Пры дэфіцыце валюты выгада і для рэспублікі, і для краіны відавочная. Тым больш, што наш кааператыў пакуль па-за канкурэнцыяй у Савецкім Саюзе. Спрабавалі наладзіць вытворчасць падобных навукова-даследчых прылад кааператары Масквы і Грузіі. Але нешта не бачна іх прадукцыі. Магчыма, ужо адмовіліся ад гэтай задумкі. Адной прагі лёгкай нажывы тут мала. Таму ні дылетанты, ні спекулянты ў сферы «нашай» кааператыўнай дзейнасці не прыжывуцца. Дарма хвалююцца «ўлады»,— разважыў Леанід.

Зрэшты, непакояцца чыноўнікі проста на ўсялякі выпадак, каб, крый божа, чаго не здарылася і «гідра капіталізму» не распаўзлася па целе нашай хворай эканомікі. Астатняе не ў іх кампетэнцыі. І калі ў цэлым дзяржава, грамадства нейкім чынам зацікаўлены ў вытворчасці дэфіцытных прылад, то дзяржаўныя мужы адмахваюцца ад кааператараў стосамі пастаноў і пратаколаў. Сістэма... абсурдна-складаных ураўненняў з усімі вядомымі. Як яе рашыць?

М. МАСТОЎСКІ.

# ЛАБІРЫНТ САМА-асэнсавання

Жыццё чалавека ўяўляецца аўтару лабірынтам самаасэнсавання, у якім адшукаць патаемны шлях да святла, да свайго прадвызначэння, вышэйшага шчасця можна не інакш, як даследуючы і пераадольваючы тупікі ўласнага невуцтва, памылак, дрэнных схільнасцей, песімізму і іншых недасканаласцей чалавечага духу.

Афарызмы, якія прадстаўлены на суд чытача ў кнізе В. А. Старычэнкі «Лабиринт самоосознания»,—гэта прасвятленні, уласныя адкрыцці аўтара, згрупаваныя ім па тэматыцы ў асобныя раздзелы.

Дадзены зборнік кароткіх вывадаў — споведзь розуму, які прапаведуе здабытую мудрасць,— закліканы, па задумцы аўтара, актыўна стымуляваць інтарэс і імкненне маладых чытачоў да самапазнання і ўдасканалення, да ўзыходжання па прыступках духоўнасці, маралі, мудрасці.

Выданне філасофска-этычных сілагізмаў В. А. Старычэнкі стварыла прэцэдэнт, які выдатна паказвае магчымасць, высокую значнасць і, больш таго, надзённую неабходнасць заахвочвання любога думаючага чалавека да штодзённай філасофска-літаратурнай творчасці, якая абумоўлівае ўзвышэнне маральных патрэб і ідэалаў нашага грамадства.

В. КОНАН,
доктар філасофскіх навук.

Набыць кнігу «Лабиринт самоосознания» можна ў кіёску галоўнага корпуса.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

# ЗНАК — ВУХА

*Пачатак у № 28 за 1989 год.*



тся ться

Канцоўка тся (ться) прыкметна адрозніваецца ад спалучэння СТ. Знак СТ закруглены толькі ў верхняй частцы, а далей пяро ідзе ўніз строга па прамой лініі. У заканчэнні ТСЯ прававугольнай часткі не відно, увесь гэты знак — суцэльнае закругленне.

Пішыце СТ і ТСЯ цэлы радок:



ст тся ст тся

Закругленне знака СТ атрымліваецца даволі натуральна, без нейкіх дадатковых прыёмаў. Пры напісанні ТСЯ мы робім дадатковы штуршок управа, з'яўляецца цэнтрабежная сіла, якая і надае закругленне ўсяму знаку.

Знакі СТ і ТСЯ лягчэй успрымаюцца пры накладванні на авал:



Знак СТ толькі ў пачатку закруглення супадае з авалам, а далей пяро ідзе па дыяметру авала. Знак ТСЯ ідзе па арбіце авала і толькі ў ніжняй частцы пяро пачынае зразаць дугу.



вист виться лист литься видится лишиться плетётся

Знак ТСЯ пасля знакаў, якія заканчваюцца востра. Як і знак СТ, канчатак ТСЯ не адразу развітваецца з вострымі знакамі; злучальная лінія спачатку падымаецца ўверх па следу папярэдняга знака:



мест иметься пишется подпишется встретится встретиться

Знак ТСЯ заканчваецца рухам улева ці ўніз, але не ўверх.



правильно неправильно



льстится слышится дышится стремится взмыться вместиться

***ПРАКТЫКАВАННЕ:***

***Дымиться взвиться селиться селится подселиться делиться веселится спится влиться ведется экономист экономится***

***Пес льстится. Взвиться ввысь. Делиться с кем? Лишиться сети. Встретиться в селе. Пес стремится в лес. В школе экономится электричество. Вместиться в квартире.***

*Урок вёў Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.*

# МАЙСТРОЎНЯ

*Супрацоўніцтва, кантракты, кантакты, дзелавыя сувязі. Хіба можна без усяго гэтага пражыць сёння любой арганізацыі, аб'яднанню ці нават проста няўрымсліваму чалавеку. А наш клуб, між іншым, грамада творчых асоб. Таму, безумоўна, не застаўся ў баку ад новай жыццёвай плыні. Аддаючы даніну часу, модзе і беручы, заадно, тое, што нам мо калі-небудзь спатрэбіцца, мы абмяняліся з гродзенскімі сабратамі па пяру творчымі дасягненнямі. Паколькі талент не прадаецца, то наша пагадненне не камерцыйнае, а сяброўскае. Асноўны яго прынцып: «Ты мне — я табе». Жадаючых далучыцца (я маю на ўвазе творчыя аб'яднанні іншых ВНУ рэспублікі) сардэчна запрашаем у наш гурт. Словам, прадстаўляем саюзнікаў «Майстроўні» — літаратурнае аб'яднанне Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта «Наднёманскія галасы».*

*Вядучы клуба*
*Мікола ДЗЯБЕЛА.*

*Игорь*
*ЗАВЬЯЛОВ*

## На перроне

Вьется локон, упавший
с ладони,
Зачеркнула улыбку слеза.
И целую я в лёгком поклоне
Твои руки, лицо и глаза.

Не спеши снова трогать
прическу,
Дай мне выбрать глазами
твой взгляд.
Руки нежные, тонкого воска
Пусть, волнуясь, мои
теребят.

Ты до боли себе искусала
В ожиданьи подкрашенный
рот.
И глядишь широко и устало
Словно глуби разлившихся
вод.

Знаю, вижу — разлука
жестока —
Столько новых морщин и
седин!
Здравствуй, мама, ты всё
одинока?
Я вот тоже один и один.

* * *

Грозных небес посветлевшие
глыбы
Двигает гром за рекой.
Чуть улыбаются мокрые
липы,
Трогая небо рукой.

Снова увидев, как плещет
лениво,
Лодки качая, волна,
Из глубины ли речного
залива
Тихо всплывает луна.

Где-то нежней засверкавшей
хрустали
Первые звезды зажглись...
Мы не от счастья ль однажды
устали,
Прожив здесь целую жизнь?





Фота В. МАЙСЯЁНКА.

*Андрэй ПЯТКЕВІЧ*

## Гарбуз

(санет)

На градках, дзе вясёлыя
наўкол
Расліны: морква, рэпа,
памідоры,
Дзе кабачкі жаўцеюць, нібы
зоры,
І агуркі ачэпліваюць дол,—

Гарбуз ляжыць, як пасля
працы вол,
Ды ўсміхаецца — ён сёння
ў гуморы,
І ад нітратаў шчэ не вельмі
хворы.
У хуткім часе трапіць ён
на стол.

Качаецца, як бочка,
на узмежку,
А лета шле яму сваю
ўсмешку.
І гаспадыня, стаўшы на мяжы,
Глядзіць на агародчык ціха
й ветла;
І думка, нібы пчолка, уецца
светла:
«Вось ладны вырас, што ты
ні кажы».

*Татьяна*
*ОБУХОВСКАЯ*

## Голубая Долина

Вас зовёт Голубая Долина
И манят золотые огни,
Там овеет легенда, былина
Ваши долгие, серые дни.
Вами бредят бескрайние
дали,
Загораются звезды во мгле.
Вы еще ничего не видали,
Что ж оплакивать вам на
земле?
Не сдавайтесь
судьбе-исполину,
И тяжелые цепи падут,
И свою Голубую Долину
Те, что ищут,— я верю —
найдут.

## Ноктюрн

Утонуть бы в июльской ночи,
Затеряться бы в зарослях
трав,
Внять покою погасшей свечи,
Все земное навеки поправ.

О, как нежно звенит тишина!
Пропасть звезд, словно
купол над ней...
Ничего, что погасла одна
В нескончаемом море огней.

Ничего преходящего нет:
Что погасло, то вспыхнет
опять,
Что б лазурный,
немеркнущий свет,
Над веками смеясь,
излучать.



### ДА ВЕДАМА

У нашага літаб'яднання ёсць невялічкая гісторыя і пэўныя заслугі перад беларускай літаратурай. У розныя гады членамі «Наднёманскіх галасоў» былі вядомыя цяпер паэты і пісьменнікі БССР Д. Бічэль-Загнетава, П. Макаль, кіраўнік абласнога аддзялення СП БССР А. Карпюк, Ф. Янкоўскі, Г. Юрчанка.

### ДЛЯ РОЗДУМУ

Творчыя вытокі сённяшніх членаў літаб'яднання — своеасаблівы працяг пошукаў сваіх папярэднікаў. Некаторыя з нашых паэтаў, у прыватнасці, Юры Карэйва і Юрась Пацюпа, ужо падрыхтавалі да друку свае першыя зборнікі вершаў. Андрэй Пяткевіч, Таццяна Абухоўская, Ігар Заўялаў, Едрусь Мазько і Ганна Шакалей таксама, пэўна, не ўступаюць па майстэрству сваім сябрам. Аднак і тых, і другіх аб'ядноўвае любоў да роднага краю, матчынага слова, імкненне сказаць нешта сваё, адметнае. Зрэшты, мяркуйце самі, шаноўныя чытачы.

М. МІКУЛІЧ,
кіраўнік літаб'яднання «Наднёманскія галасы», асістэнт кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

*Юрась ПАЦЮПА*

## Летуценні

Заплюшчу вочы — неба
застанецца,
ад'еду ў свет — а край
на вастрыі...
Ад ціхіх дум анікуды
не дзецца,
ад часу не схавацца на зямлі.
Курыны ем, а лета
адыходзіць,
не тут са мною, недзе
ў глыбіні,
І дзіўны свет бяжыць
па агародзе,
як блёкату празрыстыя агні.

*Юры КАРЭЙВА*

## Спроба замовы на ўраджай

Паслухай свайго нашчадка,
Сівы мой паганьскі божа:
Ад самага дзён пачатку
На сэрцах людскіх трывожна,
Чакаюць тваю агнявіцу
З тваіх непадступных нябёсаў.
Ну до ўжо табе гнявіцца:
Успыхні ж над нашым лёсам!
Пашлі жа, Пяруне, маланку,
Або хоць малую іскрынку,
Каб дождж малады на ранку
Слязну шчаслівую зрынуў,
Няхай жа яна на руні
Рассыплецца золатам росаў,
Каб ты зноў па ёй, Пяруне,
Ступіць мог нагою босай!..

*Виктория*
*КОЛПАКОВА*

Ну вот — расставанье...
Забыты обиды,
забыты внезапные злые
слова.
Какие еще в жизни тайны
открыты,
какие нас ждут впереди
острова?
Десятый, последний...
Уроки, походы
и дружные встречи за
круглым столом...
Теперь это в прошлом,
себя не осудим,
А, может, потом уже,
после поймем.
Сейчас уже в сердце
и горечь разлуки,
И вольная радость,
свободный полет.
Раскинуть бы крылья,
а, может быть, руки!
Взлететь!
Так и просится сердце в
полет.

*Ганна ШАКАЛЕЙ*

Чароўны момант лёгкага
падзення
З галінкі дрэва жоўтага
лістка...
Праносіць думку ў адно
імгненне
Аб тым, што недалёка і зіма.
Абступіць цішыню сівым
туманам,
За вокнамі пачнуць гуляць
вятры.
І панясуцца думкі нечакана
У чароўны свет — да будучай
вясны.

*Едрусь*
*МАЗЬКО*

Хто прыйшоў першым?
Хто прыйдзе апошнім?
Гэты шлях —
сусветная немата,
І ты ня будзеш ведаць
свой парадкавы нумар.

* * *

Спадаюць долу зоркі...
Бясконцасць затушыла іх
Халодным пацалункам...





Фота Я. МАТВЕЕВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

15 САКАВІКА
Зак. 2006.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.